

НА ШЛЯХУ ДА «ДАЖЫНАК» 4

ВЯРТАННЕ ВАЖНЫХ СЭНСАЎ 13




Выдаецца з 9 чэрвеня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

+TV ПРАГРАМА

5 ЛІПЕНЯ 2024 г. ПЯТНІЦА № 129 (30263)


## КОРАТКА

• У Беларусі прагназуецца павелічэнне ўраджаю прыкладна на 15 працэнтаў да ўзроўню мінулага года.

• У Брэсцкай вобласці ў час збожжаўборачнай кампаніі ў палі выйдзе амаль 1,4 тыс. камбайнаў.

• Каля 1,8 тыс. адзінак транспарту знаходзіцца ў чарзе на ўезд у ЕС.

• Рэзідэнты краін Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва амаль у чатыры разы павялічылі аб'ёмы біржавога гандлю на Беларускай універсальнай таварнай біржы.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Вольга ЛАЗОРКІНА, аналітык Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў:**

*«Беларусі сёння вельмі важна далучацца да альтэрнатыўных пляцовак, якія фарміруюць вобраз будучыні, заснаванай на мірным стабільным развіцці. Гэта раўнапраўныя ўмовы, наколькі гэта магчыма. Мы разумеем, што гэта ідэал, але, тым не менш, павінны быць раўнапраўныя ўмовы ў эканамічным і тэхналагічным развіцці, у пытаннях лагістыкі і пастаўкі тавараў, гандлю. Вельмі важны і палітычны складнік: сёння палітыка стала пераважаць над эканомікай, над розумам, над прагматызмам. Таму ў вобразе будучыні ёсць вялікі палітычны блок — гэта новая формула міжнароднага ўзаемадзеяння, якая цяпер выпрацоўваецца ў рамках не толькі ШАС, але і БРІКС».*

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «У НАШЫХ СІЛАХ РАЗБУРЫЦЬ СЦЕНЫ АДНАПАЛЯРНАГА СВЕТУ»

## Якія ідэі будзе прасоўваць Беларусь, стаўшы паўнапраўнай удзельніцай ШАС

**4 ліпеня 2024 года, несумненна, увойдзе ў гісторыю нашай краіны: у гэты дзень Беларусь стала паўнапраўным членам Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва. У Астане на саміце ШАС паставілі свае подпісы кіраўнікі дзяржаў-удзельніц і Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка.**

**Такім чынам, Беларусь стала дзясятым па ліку паўнапраўным членам «сям'і ШАС». Аналагічным статусам у арганізацыі валодаюць Індыя, Іран, Казахстан, Кітай, Кыргызстан, Пакістан, Расія, Таджыкістан і Узбекістан.**



Фота БелТА.

«Рашэнне аб паўнапраўным членстве Рэспублікі Беларусь у Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва прынята. Паважаны Аляксандр Рыгоравіч, шчыра віншую вас. Упэўнены, сённяшні дзень стане яркай старонкай у гісторыі Беларусі», — сказаў Прэзідэнт Казахстана Касым-Жамарт Такаеў, які старшынстваваў на саміце. Ён выказаў упэўненасць, што Беларусь унясе свой значны ўклад ва ўмацаванне бяспекі на прасторы ШАС.

Аляксандр Лукашэнка выказаў словы падзякі ў адрас гаспадароў саміту — казахстанскага боку — за цудоўную арганізацыю сустрэчы і сардэчны прыём у Астане. «Дзякуючы ў тым ліку і вашаму паспяховаму старшынству гэты дзень увойдзе ў гісторыю Беларусі як дата далучэння нашай краіны да Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва», — сказаў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка назваў паказальным і сімвалічным яшчэ і той факт, што год прыняцця ў ШАС супаў з 80-годдзем вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. «Гэта цудоўны падарунак беларускаму народу», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт таксама падзякаваў астатнім калегам — кіраўнікам дзяржаў ШАС — за аднадушную падтрымку гэтага рашэння.

Кіраўнік дзяржавы расказаў аб канкрэтных кірунках, якім Беларусь у якасці паўнапраўнага ўдзельніка плануе ўдзяліць павышаную ўвагу. Ён запэўніў, што краіна гатова працаваць поплеч з новым старшынствам (пасля Казахстана старшынства ў ШАС пяройдзе Кітаю) па рэалізацыі сумесных прыярытэтаў.

### АБ МІЖНАРОДНАЙ БЯСПЕЦЫ

«Глыбока перакананы, што ў XXI стагоддзі неабходна выбудоўваць сапраўдную і непадзельную глабальную бяспеку. Пры гэтым ініцыятыву павінны ўзяць на сябе краіны Глабальнай большасці, паколькі самазакаханы, эгаістычны Захад на такое аказаўся не здольны. Там сёння няма лідараў, здольных прымаць адказныя рашэнні самастойна», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Са свайго боку, запэўніў ён, Беларусь пастараецца адаптаваць свае ініцыятывы ў гэтай найбольш актуальнай сёння для партнёраў сферы.

### АБ ЭКАНОМІЦЫ

Кіраўнік дзяржавы канстатаваў, што ўжо цяпер у партнёраў па ШАС ёсць узаемавыгадныя праекты ў энергетыцы, транспарце і лагістыцы, фінансах і прамысловай кааперацыі. «Калі мы выпрацуем на нашай пляцоўцы дакладныя правілы, выйграюць усе, у тым ліку за межамі рэгіёна адказнасці ШАС», — упэўнены беларускі лідар.

### АБ ХАРЧОВАЙ БЯСПЕЦЫ

Гаворачы аб харчовай бяспецы, Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што выклікі ў гэтай галіне зыходзяць не толькі ад традыцыйных фактараў, такіх як змяненне клімату і прыродныя катаклізмы, але і штучных бар'ераў, у тым ліку незаконных санкцый адносна мінеральных угнаенняў, тэхнікі, сродкаў ахоны раслін, маршрутаў паставак. Як вынік, людзі ў краінах, якія развіваюцца, уключаючы найбяднейшыя дзяржавы Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі, вымушаны галадаць.

«У нашых сілах разбурыць сцены аднапалярнага свету, накарміць людзей, устараніўшы шмат супярэчнасцяў і канфліктаў з-за сацыяльнай няроўнасці, дэфіцыту харчавання і рэсурсаў», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

### АБ МІЖНАРОДНЫМ ПАЗІЦЫЯНАВАННІ

«Мы пастараемся прыкласці ўсе намаганні, каб рос аўтарытэт нашай арганізацыі, шырылася кола яе саюзнікаў і прыхільнікаў», — запэўніў Аляксандр Лукашэнка.

Ён адзначыў, што многія беларускія ідэі, выказаныя раней, ужо атрымалі міжнародную падтрымку. Гэта датычыцца трансферу тэхналогій, інфармацыйнай бяспекі, транспарту і лагістыкі, прамысловасці, гандлю і інвестыцый.

«Цяпер ужо ў новай якасці мы будзем імкнуцца максімальна ўвязаць нашы прапановы з ініцыятывамі нашай арганізацыі», — сказаў Прэзідэнт.

### АБ УЗАЕМНЫМ УЗБАГАЧЭННІ КУЛЬТУР

«Беларусь пачынае работу ў Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва з разуменнем, што ШАС — гэта не толькі бяспека, эканоміка і гандаль. Гэта і ўзаемнае ўзбагачэнне культур, што прывядзе да абавязковага збліжэння нашых народаў», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

СТАР. 2

Запрашальнік

# ВЯНОК СЯБРОЎСТВА І ЯДНАННЯ

## Старадаўні славянскі купальскі сімвал стане сёлета абярэгам для ўсіх, хто прыедзе на рэспубліканскае свята «Купалле» — «Александрыя збірае сяброў»

**Яно вось-вось уступіць у свае правы — зачаруе, захопіць у свае цёплыя ліпеньскія абдымкі і закруціць у магічным купальскім віхры. Свята ў Александрыі будзе адзначацца сёлета 15-ы раз і абяцае стаць адным з самых яркіх і запамінальных. У фестывальнай афішы шмат цікавых конкурсаў, мерапрыемстваў, канцэртаў. У госці да нас едуць шматлікія госці і майстры з усёй Беларусі і Расіі. Традыцыйная купальская лугавіна сёлета стала на гектар шырэйшай, чым у папярэдня гады, каб умясціць усіх ахвотных паўдзельнічаць у купальскай дзеі. Сёння арганізатары яшчэ раз ацэняць узровень падрыхтоўкі купальскай пляцоўкі, каб канчаткова аб'явіць старт. Заўтра з 11.00 пляцоўка напоўніцца гоманам, смехам, смачнымі пахамі. Ці можна такое прапусціць? Добрая нагода адкласці свае справы і далучыцца да галоўнага купальскага свята краіны!**



СТАР. 13

ISSN 1990 — 763X

# «У НАШЫХ СІЛАХ РАЗБУРЫЦЬ СЦЭНЫ АДНАПАЛЯРНАГА СВЕТУ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**Таксама Прэзідэнт прыняў удзел у сустрэчы ў фармаце «ШАС плюс».**

**У форуме ўдзельнічалі не толькі кіраўнікі дзяржаў — членаў ШАС, сярод якіх цяпер і Беларусь, але таксама лідары дзяржаў-назіральнікаў, ганаровыя госці і кіраўнікі міжнародных арганізацый.**

«Тут слухаюць і чуюць адзін аднаго, не дыктуюць сваю волю, хоць у Арганізацыі прадстаўлены сусветныя гранды. Запэўніваю вас, мы будзем рабіць усё, што ад нас залежыць, каб у свеце вага і аўтарытэт нашага аб'яднання пастаянна ўзрасталі», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

«Ёсць вельмі ёмістае выказванне, якое добра адлюстроўвае сутнасць сучасных працэсаў: «Якраз цяпер адбываюцца перамены, якіх не было на працягу ста гадоў, і мы разам рухаем гэтыя перамены». Старшыня КНР Сі Цзіньпін. Сапраўды, мы ўсе з'яўляемся ўдзельнікамі сур'ёзных сістэмных змяненняў у сусветнай палітыцы», — канстатаваў беларускі лідар.

Паводле яго слоў, у аснове гэтых змяненняў — нараджэнне сусветнай шматпалярнай сістэмы міжнароднай бяспекі і супрацоўніцтва. «Аднак «залаты мільярд» гэта перспектыва не радуе. Каланізуючы і неміласэрна эксплуатуючы ўсе астатнія краіны, Захад такім пірацкім спосабам на працягу стагоддзяў стварыў фундамент свайго багацця, палітычнай, эканамічнай і ваеннай перавагі, — заўважыў кіраўнік дзяржавы. — Вашынгтонска-лонданскі гегемон глядзіць на свет як на сваю ўласнасць. Шматмільярднае насельніцтва планеты для яго не людзі, а сродкі для дасягнення асабістага дабрабыту. Вось і ўся палітэканомія».

«У рамках гэтай філасофіі і быў спраквакаваны канфлікт на Украіне, які прадаўжаецца да гэтага часу. І ведаем, па якой прычыне. Як вынік — свет сёння ў глыбокім крызісе», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

«Глыбока перакананы, найлепшым адказам на выклікі ў глабальнай палітыцы будуць нашы адзінства і згуртаванасць. Для гэтага мы павінны кансалідавацца на той прасторы, якая з'яўляецца зонай адказнасці Арганізацыі. Менавіта такі падыход вызначае неабходнасць стварэння Вялікай Еўразіі», — заявіў беларускі лідар і абазначыў некалькі крокаў у гэтым напрамку.

## АБ ІНІЦЫЯТЫВЕ ПРЫНЯЦЦЯ ЕЎРАЗІЙСКАЙ ХАРТЫІ

Кіраўнік дзяржавы прапанаваў выпрацаваць канцэпцыю, назва і праект якой ужо ёсць, — Еўразійская хартыя разнастайнасці і шматпалярнасці ў XXI стагоддзі. Яе ідэя ўзнікла па выніках міжнароднай канферэнцыі, праведзенай летась у кастрычніку ў Мінску.

Аляксандр Лукашэнка заявіў, што цяпер гэта канферэнцыя ў Мінску стала ўжо штогадовым мерапрыемствам па рэгіянальнай бяспецы. «Больш за тое, мы разглядаем яго як своеасаблівую еўразійскую альтэрнатыву трансатлантычнай Мюнхенскай канферэнцыі, — адзначыў Прэзідэнт. — Запрашэнні кіраўніцтву вашых МЗС на мінскую канферэнцыю, якая пройдзе гэтай восенню, ужо накіраваны. Вельмі хацеў бы, каб прадстаўнікі вашых краін удзельнічалі ў абмеркаванні Хартыі. Лічым, што яна павінна быць прынята на ўзроўні кіраўнікоў дзяржаў».

## АБ СПАЛУЧЭННІ ІНТЭГРАЦЫЙНЫХ ПРАЦЭСАЎ

Прэзідэнт таксама заявіў аб неабходнасці ўдзяляць больш увагі розным інтэграцыйным працэсам на Еўразійскім кантыненце.

У гэтым плане ён заклікаў да хуткіх крокаў, бо час спрасаваны і неабходна дзейнічаць аператыўна. «Сітуацыя цяпер такая, калі людзі ў свеце знаходзяцца ў разгубленасці і няведанні. Толькі што Генеральны сакратар ААН пацвердзіў тую канфліктнасць і небяспеку ў перспектыве развіцця нашай планеты. Людзі чакаюць нейкай арыентацыі і пэўнасці. Гэта можа зрабіць ШАС. Але гэта трэба рабіць хутка, таму што час сціснуты. Гэта не тое, што было тады — пасля Другой сусветнай вайны, і час патрабуе хуткіх крокаў.

Ён адзначыў актыўную інтэграцыю на постсавецкай прасторы ў рамках Саюзнай дзяржавы, Еўразійскага саюза, Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы, Садружнасці Незалежных Дзяржаў. Набіраюць абароты іншыя еўразійскія аб'яднанні — АСЕАН, Арганізацыя ісламскага супрацоўніцтва, Ліга арабскіх дзяржаў. Рэалізоўваюцца важныя ініцыятывы, якія звязваюць кантынент стратэгічнымі інфраструктурнымі праектамі, перш за ўсё кітайскі праект «Пояс і шлях», расійскі праект Паўночнага шляху. «Неабходна знайсці пункты спалучэння ўсіх гэтых працэсаў, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Трэба ўтрэсці інтарэсы ўсіх гульцоў».

## АБ ФІНАНСАХ

Кіраўнік беларускай дзяржавы прапанаваў узмацняць практычнае ўзаемадзеянне па ўсім комплексным парадку дня ШАС і пачаць з фінансаў.

«У якасці прыярытэтнага пытання Беларусь разглядае стварэнне механізму двухбаковых плацяжоў у нацыянальных валютах і калектыўнага фінансавага інстытута ШАС», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Ён канстатаваў, што краіны ШАС сапраўды займаюць значную долю ў сусветным насельніцтве і па долі сусветнага ВУП. «Толькі ў нашай арганізацыі знаходзяцца два наймагутнейшыя лідары — Кітай і Расійская Федэрацыя. І ўсё дрыжым перад гэтым доларам. Ну давайце, нарэшце, зробім пэўныя крокі, каб менш залежаць ад гэтага долара. І вы ўбачыце: спалохаўшыся, тыя, хто маніпулюе доларавай дубінай, зразумеюць, што далей так быць не можа. Мы гэта ўсё бачым, але не робім».

## АБ ДАСТУПНАСЦІ ЛІЧБАВЫХ ТЭХНАЛОГІЙ

Яшчэ адна прапанова датычыцца ўмацавання супрацоўніцтва ў сферы лічбавых тэхналогій, якія становяцца неад'емным элементам жыцця. «Тых лічбавых тэхналогій, якія выгадныя для народаў і эканомікі. Але не таго штучнага інтэлекту, якога мы з асцярогай чакаем. Выгадамі ад перадавых распрацовак павінны карыстацца ўсе, а не толькі заходнія краіны і транснацыянальныя карпарацыі», — сказаў Прэзідэнт.

## АБ УКЛАДЗЕ БЕЛАРУСІ Ў АГУЛЬНЫЯ НАМАГАННІ КРАІН ШАС

Аляксандр Лукашэнка запэўніў, што Беларусь гатова ўносіць пасільны ўклад у агульныя намаганні краін — членаў ШАС па такіх кірунках, як прамысловасць, гандаль, навука, культура, адукацыя.

Гэта ж датычыцца і сферы харчовай бяспекі, і сельскай гаспадаркі, на якой Прэзідэнт асобна акцэнтаваў увагу. «Людзі бяднеюць у свеце, голад становіцца шырэйшым», — заўважыў ён.

Прэзідэнт запрасіў у наступным годзе ўвасобіць у жыццё ідэю экспазіцыі «АграШАС» у рамках найбуйнейшай сельгасвыстаўкі Беларусі «Белагра». «Яна існуе шмат гадоў і заваявала ўвагу многіх спецыялістаў. Будзем рады бачыць у Мінску ўсе краіны сям'і ШАС, а таксама прэзентацыю Дэманстрацыйнай базы ШАС па абменах і навучанні аграрным тэхналогіям», — сказаў Прэзідэнт.

«Беларусь вельмі ганарыцца тым, што стала паўнапраўным членам ШАС. І мы будзем умацоўваць шанхайскі дух арганізацыі, заснаванай на прынцыпах узаемнай павагі, роўнасці і салідарнасці», — сказаў Кіраўнік дзяржавы.

Ён запэўніў, што Беларусь, як еўрапейская краіна, будзе рабіць усё, каб ШАС стала глабальнай арганізацыяй. «Дазвольце запэўніць, што Беларусь будзе нязменна кіравацца гуманнымі прынцыпамі, якія прапаведуюцца ў нашай арганізацыі. Абсалютна не сумнявайцеся, Мінск зойме годнае месца сярод прадстаўленых тут сталіц. Нам ёсць што прапанаваць па канкрэтных кірунках узаемадзеяння. У нас за спінай амаль дзесяцігадовы вопыт назіральніка ў ШАС, устойлівыя палітычныя кантакты і эканамічныя сувязі з усімі членамі Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Ён запрасіў усіх да супрацоўніцтва і вымавіў на беларускай мове наступную фразу: «Будзем рады шчыра вітаць вас у гасціннай Беларусі, дарагія сябры!»

**Паводле прэс-службы Прэзідэнта.**




## На палях саміту ШАС Прэзідэнт Беларусі правёў некалькі двухбаковых сустрэч

**Аляксандр Лукашэнка сустрэўся са Старшынёй КНР Сі Цзіньпінам.** Кіраўнік Кітая перш за ўсё павіншаваў Аляксандра Лукашэнку з атрыманнем Беларуссю новага статусу ў Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва.

Ён нагадаў, што ў мінулым годзе Прэзідэнт Беларусі двойчы наведаў з візітам Кітай. У час праведзеных перагавораў бакі намецілі планы па развіцці ўсепагоднага і стратэгічнага партнёрства. Шчыльныя кантакты падтрымліваюцца на ўсіх узроўнях.

«Мы абавязкова будзем садзейнічаць далейшаму стабільнаму развіццю нашых адносін», — заявіў Сі Цзіньпін. Пры гэтым, дадаў кітайскі лідар, бакі маюць намер рухацца ў гэтым кірунку сямімільнымі крокамі.

Аляксандр Лукашэнка ў сваю чаргу выказаў падзяку Старшыні КНР за каласальную падтрымку Беларусі на шляху да членства ў ШАС.

«Я вельмі рады, што вы становіцеся старшынёй (у 2025 годзе Кітай будзе старшынстваваць у ШАС. — Заўв.), гэта значыць, што ў мяне будзе лішняя магчымасць у будучым годзе наведаць Кітайскую Народную Рэспубліку. Я выпісаў вашы ініцыятывы, якія вы прасоўваеце ў ШАС (глабальная бяспека, глабальнае развіццё, глабальная цывілізацыя, глабальнае кіраванне штучным інтэлектам — вы ўжо заўважылі і станоўчае, і адмоўнае ў штучным інтэлекце), — мы ўсяляк падтрымліваем усе вашы ініцыятывы — па ўрэгуляванні ўкраінскага крызісу, гэтая ініцыятыва сугучная з ініцыятывай Бразіліі», — адзначыў Прэзідэнт.

На сустрэчы з **прэм'ер-міністрам Пакістана Шахбазам Шарыфам** кіраўнік беларускай дзяржавы прапанаваў дапрацаваць і зацвердзіць дарожную карту развіцця двухбаковага супрацоўніцтва на перспектыву.

Шахбаз Шарыф аднавіў запрашэнне кіраўніку беларускай дзяржавы наведаць з візітам Пакістан. Беларускі лідар павіншаваў Шахбаза Шарыфа з нядаўнім абраннем прэм'ер-міністрам, а таксама паабяцаў, што да канца гэтага года пастараецца абавязкова пабываць у Пакістане. «Вымалёўваецца кароткі план нашых арганізацыйных мерапрыемстваў у гэтым годзе, — адзначыў ён. — У верасні сустрэнуцца члены міжпраўкамісіі нашых краін. У кастрычніку наш прэм'ер-міністр у рамках мерапрыемства кіраўнікоў урадаў краін ШАС будзе ў вас у Пакістане. Вельмі хацеў бы, каб вы знайшлі час з ім сустрэцца».

«Напэўна, той перыяд, калі мы прыглядаліся, вывучалі адзін аднаго, спрабавалі разгледзець тыя кірункі, па якіх мы можам супрацоўнічаць, скончыўся. Нам час пераходзіць да канкрэтных мерапрыемстваў па ўстанаўленні вельмі цесных сувязяў паміж нашымі краінамі», — дадаў беларускі лідар.

Прэзідэнт Беларусі таксама сустрэўся з **Генеральным сакратаром ААН Антоніа Гутэрышам** і **прэзідэнтам Турцыі Рэджэпам Таіпам Эрдаганам.**

Святочнае

# Дзецi незалежнай краiны

## Наталля КАЧАНАВА павіншавала матуль, якія нарадзілі дзетак у Дзень Незалежнасці

**Наведванне Старшынёй Савета Рэспублікі РНПЦ «Маці і дзіця» адбылося ў межах акцыі «Белая Русь — з любоўю да дзяцей». Упершыню гэтае мерапрыемства было наладжана ў 2008 годзе, а з наступнага, 2009-га, парадзіхі прымаюць віншаванні і падарункі ва ўсіх радзільных дамах і аддзяленнях краіны. Сёння ў добрай традыцыі удзельнічаюць не толькі члены ГА «Белая Русь», але і прадстаўнікі органаў дзяржаўнай улады, дэпутацкага корпуса, кіраўнікі прадпрыемстваў і ўстаноў, вядомыя культурныя і грамадскія дзеячы.**

Падчас віншаванняў Наталля Качанава звярнула ўвагу на тое, што ў нашай краіне клопат аб дзецях і сем'ях з дзецьмі — адзін з галоўных дзяржаўных прыярытэтаў. Гэты кірунак заўжды пад пільнай увагай Прэзідэнта. Сёння сем'і, якія выхоўваюць дзяцей, атрымліваюць больш дзясятка дапамог розных відаў. І гэта яшчэ далёка не ўсе формы дзяржпадтрымкі: створаны ўсе ўмовы для выхавання і навучання дзяцей, аказання належнай медыцынскай дапамогі. Старшыня Савета Рэспублікі падкрэсліла: у Беларусі ўвогуле ўся палітыка накіравана на чалавека, на якасць і камфорт яго жыцця. Адзначыла яна і важнасць, асабліва ў цяперашні час, захавання традыцыйных каштоўнасцяў, сярод якіх сям'я і дзеці — найгалоўнейшыя.

«Гэта невымоўныя эмоцыі, калі на свет з'яўляецца новы чалавечак, новы грамадзянін нашай краіны. І вельмі добра, што ў нас ёсць такая акцыя, якую мы праводзім ужо 16-ы раз. Тут, у Рэспубліканскім навукова-практычным цэнтры, згодна з устаноўкай Прэзідэнта, дапамагаюць жанчынам з усіх рэгіёнаў нашай краіны. Я з вялікай радасцю бываю тут, каб павіншаваць матуль, якія нарадзілі ў самае галоўнае свята краіны — Дзень Незалежнасці. А сёлета той радасці ўдвая больш, бо мы святкуем яшчэ і 80-годдзь юбілей вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў», — рэзюмавала Наталля Качанава і пажадала ўсім жанчынам і іх дзеткам здароўя і доўгіх гадоў шчаслівага жыцця.



Фота БелТА.

«Гэта маё першае дзіця. Дзяўчынка, Сафія. І тое, што яна нарадзілася ў такі дзень, — радасць, якую не выкажаш словамі. Святочны парад, салют і доўгачаканая дачушка побач — слёзы на вачах. Дзень Незалежнасці для мяне, як і для ўсіх беларусаў, — асаблівы дзень, а цяпер ужо ўдвая», — падзялілася ўражаннямі Ганна Бурая, адна з матуль, хто прымаў віншаванні.

У сваю чаргу **старшыня Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Белая Русь» Алег РАМАНАЎ** зазначыў, што за гады існавання акцыя «Белая Русь — з любоўю да дзяцей» значна пашырылася, прычым не толькі ў рэгіянальным сэнсе, але і ў часавым. З мінулага года дзяцей, якія нарадзіліся ў святочны дзень, суправаджаюць на працягу ўсяго іх сталення, адзначаючы найбольш важныя вехі дзіцячага жыцця.

* * *

Усяго 3 ліпеня ў Беларусі ў юбілейны Дзень Незалежнасці нарадзілася 158 дзяцей (на 40 больш, чым летась), 69 дзяўчынак і 89 хлопчыкаў.

Найбольш дзяцей нарадзілася ў Мінску — 57 мінчан, з іх у РНПЦ «Маці і дзіця» — 13 дзяцей, астатніх прынялі ў радзільных дамах №№ 1, 2, 5, 6. Першае немаўля ў сталіцы з'явілася ў першую хвіліну Дня Незалежнасці (00.01) у радзільным доме 6-й гарадской бальніцы. У Брэсцкай вобласці нарадзіліся 14 дзяцей, з іх чатыры дзяўчынкі і дзесяць хлопчыкаў. Жыхароў Віцебскай вобласці ў святочную дату пабольшала на сем дзяўчынак і сем хлопчыкаў. У Гродзенскай і Гомельскай абласцях нарадзілася па 16 дзетак, а ў Магілёўскай — 15, з іх восем дзяўчынак і сем хлопчыкаў. У Мінскай вобласці 3 ліпеня нарадзілася 26 дзяцей — 14 дзяўчынак і 12 хлопчыкаў.

**Уладзімір ВЯРЭНІЧ.**

Пра медыцыну і не толькі



# Калі мама малады спецыяліст або студэнтка

## Каму варта павялічваць дзярждапамогі?

19 чэрвеня 2024 года Палатай прадстаўнікоў прыняты праект Закона Рэспублікі Беларусь «Аб змяненні законаў па пытаннях дзяржаўных дапамог сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей».

Ён прадугледжвае ўнясенне адпаведных змяненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб дзяржаўных дапамогах сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей», карэкціроўку Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, Закона Рэспублікі Беларусь «Аб устанаўленні і парадку павышэння мінімальнай заработнай платы». Законапраект накіраваны на ўзмацненне адраснасці і мэтавай накіраванасці ў забеспячэнні дзяржаўнымі дапамогамі.

Праз прыняцце гэтага праекта закона будуць, у прыватнасці, замацаваны прававыя нормы, якія ўстанаўліваюць павелічэнне мінімальнага памеру дапамог па цяжарнасці і родах такім катэгорыям жанчын, як маладыя спецыялісты; іншыя асобы, якія пачынаюць працоўную дзейнасць; навучэнкі і студэнткі; жанчыны, зарэгістраваныя беспрацоўнымі да заканчэння шасці месяцаў пасля звальнення (заканчэння службы, завяршэння навучання). Яны павялічацца з 50 да 100 % БПМ.

Акрамя таго, прадугледжваецца павелічэнне (з 50 да 100 % мінімальнай заработнай платы) мінімальнага памеру дапамогі па часовай непрацаздольнасці па доглядзе дзіцяці для маладых спецыялістаў і іншых асоб, якія пачынаюць працоўную дзейнасць; прызначэнне дапамогі па дзіця, якое выхоўваецца ў сям'і маці, калі бацька дзіцяці, абавязаны выплачваць аліменты, праходзіць тэрміновую ваенную (або альтэрнатыўную) службу; павышэнне ўзроўню сацыяльнай абароненасці сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў, у тым ліку пасля дасягнення імі ўзросту 18 гадоў. У прыватнасці, дапамога, якая выплачваецца да паўналецця дзіцяці-інваліда, захоўваецца і пасля спаўнення яму 18 гадоў, калі ў сям'і ёсць іншыя непаўналетнія дзеці.

У дзяржаве шмат робіцца для падтрымкі сем'яў, і новы пакет, прадугледжаны законапраектам, для маладых сем'яў вельмі важны. Згодна са статыстыкай, у Беларусі каля 40 % шматдзетных сем'яў — даволі вялікі паказчык. Але ўсё роўна хацелася б, каб ён павялічваўся. Мы павінны паглядзець на сем'і, якія выхоўваюць адно дзіця, і падтрымаць іх, каб яны перайшлі ў катэгорыю сем'яў, якія выхоўваюць дваіх дзяцей. Гэтак жа як сем'і, якія выхоўваюць дваіх дзяцей, павялічыліся да статусу шматдзетных. Гэта адна з важных задач дзяржаўнай палітыкі, якая і праецыруецца новым законапраектам.

Ён закранае маладых спецыялістаў, студэнтаў і навучэнцаў і скіраваны на тое, каб маладыя жанчыны не адкладвалі мацярынства на больш позні тэрмін. Пры гэтым неабавязкова ахвяраваць кар'ерай, вучобай дзеля сям'і, сёння гэта можна выдатна сумяшчаць. Мы ведаем вялікую колькасць паспяховых людзей, якія выхоўваюць нават не аднаго-дваіх, а траіх і больш дзяцей, і гэта не перашкаджае ім будаваць кар'еру. Шматдзетныя мамы паспяховыя ў бізнесе, на сваім рабочым месцы, і такіх прыкладаў шмат.

Ёсць і іншы важны момант: статыстыка апошніх 20 гадоў сведчыць, што сярэдні ўзрост уступлення ў шлюб пастаянна расце. Размова ўжо ідзе не пра 20-22 гады, сярэдні ўзрост у дзяўчат — больш чым 27, а ў мужчын — больш чым 29 гадоў. Аднак, нягледзячы на развіццё медыцынскіх тэхналогій, прыроду не падманеш. Дзяцей пажадана нараджаць у маладым узросце. Як медык скажу: першае дзіця жанчыне лепш нараджаць ва ўзросце да 24 гадоў. Наступныя роды могуць быць пазней, але і іх лепш надоўга не адкладваць. Вялікі перапынак паміж першымі і другімі родамі можа неспрыяльна адбіцца на рэпрадуктыўным здароўі жанчыны. З пункту гледжання дэмаграфічнай бяспекі мы зацікаўлены, каб шлюбы заключаліся раней, у іх нараджаліся дзеці, і не адно, а двое, трое і нават больш.

Увогуле, калі аналізаваць сітуацыю ў кантэксце дэмаграфічнай бяспекі, мы бачым несуцяшальную тэндэнцыю: праз некалькі дзесяцігоддзяў колькасць краін, якія будуць мець вялікую долю людзей пажылога ўзросту ў структуры насельніцтва, стане катастрафічнай. Паводле ацэнак ААН, насельніцтва свету ва ўзросце 60 гадоў і старэйшыя да 2050 года складзе больш як два мільярды чалавек, патроіўшыся за 50 гадоў. Пры гэтым з 1950 года да 2000-га яго колькасць таксама патроілася: з 205 мільёнаў вырасла да 600.

І наша краіна — не выключэнне. З аднаго боку, гэта сведчыць пра тое, што ў дзяржаве выбудавана добрая сістэма сацыяльнай падтрымкі, ахова здароўя, рэалізоўваецца комплекс дзяржаўных мер, якія спрыяюць павышэнню працягласці жыцця; робіцца ўсё, каб людзі жылі як мага больш доўга, шчасліва і забяспечана. З іншага — трэба ўсведамляць: калі будзе працягвацца тэндэнцыя «ў сям'і адно дзіця», надыдзе дэпапуляцыя. Гэта немінуча прывядзе да павелічэння дэмаграфічнай нагрузкі на працоўных.

З кожным дзесяцігоддзем моладзі будзе станавіцца ўсё менш, а людзей пенсіённага ўзросту — больш, адпаведна, не будзе каму ўтрымліваць нашых пенсіянераў. Пенсіённая сістэма ў Беларусі пабудавана на прынцыпе салідарнасці пакаленняў. Крыніцай фінансавання сённяшніх пенсій з'яўляюцца абавязковыя ўзносы ў фонд сацабароны, якія выплачваюцца работадаўцамі і работнікамі. Калі атрымальнікаў пенсій з кожным годам становіцца больш, а людзей, якія адлічваюць грошы на іх утрыманне, — усё менш, то з часам крыніца, з якой робіцца пенсіённыя выплаты, абмяльчэе. Таму важна прыняць адпаведныя меры сёння, каб папярэдзіць гэтыя негатыўныя тэндэнцыі заўтра.

**Дзмітрый ШАЎЦОЎ,**
**намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы Палаты прадстаўнікоў, генеральны сакратар Беларускага Чырвонага Крыжа.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### У Вялікабрытаніі прайшлі першыя пасля «брэксіту» ўсеагульныя выбары

Выбарчыя ўчасткі ў 650 акругах Англіі, Шатландыі, Валіі і Паўночнай Ірландыі закрыліся а 22 гадзіне ў чацвер, у той жа час былі аб'яўлены папярэднія вынікі, заснаваныя на апытанні выбаршчыкаў. На працягу ночы даныя экзітпола правяраліся, і раніцай у пятніцу большасць мясцовых выбарчых акруг аб'явіла сваіх кандыдатаў-пераможцаў.

Гэта першыя ўсеагульныя выбары ў Вялікабрытаніі пасля выхаду краіны з Еўрапейскага саюза. У Вялікабрытаніі выбары праходзяць па мажарытарнай сістэме, якая азначае, што членам парламента становіцца кандыдат, які набраў найбольш галасоў у сваёй акрузе. Гэта таксама азначае, што партыі могуць набраць вялікі працэнт галасоў па краіне, але пры гэтым не атрымаць ніводнага месца ў парламенце, калі яны нідзе не зоймуць першае месца. Партыя, якая атрымала большасць месцаў у парламенце, не менш за 326, звычайна фарміруе ўрад.

Прагнозы, распаўсюджаныя напярэдадні выбараў, прадказалі перамогу апазіцыйнай з 2010 года Лейбарысцкай партыі пад кіраўніцтвам 61-гадовага Кіра Стармера, прычым самую буйную за амаль 200 гадоў.

У выпадку аб'яўлення перамогі Лейбарысцкай партыі ўжо праз некалькі гадзін пасля гэтага кароль Карл III павінен даручыць Стармеру сфарміраваць урад, прызначыўшы яго прэм'ерам.

Паводле BBC, ніхто не сумняваўся ў перамозе лейбарыстаў, пытанне было толькі ў ступені паражэння кансерватараў. І галоўнае — ці ўдасца ім захаваць твар і застацца на другім месцы ў афіцыйным статусе «каралеўскай апазіцыі» або ўпершыню ў гісторыі яго зойме трэцяя сіла — ліберал-дэмакраты.

22 мая прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі Рышы Сунак анансаваў датэрміновыя парламенцкія выбары ў краіне. Новы склад дэпутатаў павінен пачаць работу 9 ліпеня. Афіцыйная цырымонія адкрыцця парламента намечана на 17 ліпеня.

### «Хезбала» заявіла аб запуску па Ізраілі 200 ракет і мноства дронаў з узрыўчаткай

Тэрарысты «Хезбалы» заявілі, што выпусцілі па вайсковых базах на поўначы Ізраіля 200 ракет і мноства дронаў, начыненых узрыўчаткай, напісала 4 ліпеня The Times of Israel са спасылкай на афіцыйныя заявы групоўкі. У групоўцы назвалі гэты напад адказам на авіяўдар ВПС Ізраіля, у выніку якога 3 ліпеня загінуў адзін з военачальнікаў «Хезбалы» Мухамеда Насера.

У Арміі абароны Ізраіля пацвердзілі абстрэл з тэрыторыі Лівана, у сувязі з чым у цэлым шэрагу раёнаў поўначы Ізраіля аб'яўлялі паветраную трывогу.

**У сувязі са смерцю Героя Беларусі, заслужанага работніка сельскай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь, кандыдата сельскагаспадарчых навук, старшыні праўлення СВК «Прагрэс-Верцялішкі» Васіля Апанасавіча РЭВЯКІ дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокія спачуванні яго родным і блізкім.**

Тры пытанні да ўлады

# «Уводзім у эксплуатацыю больш чым 50 аб'ектаў»

**У ліпені адзін з буйных раёнаў Прыдняпроўскага краю — Магілёўскі — будзе адзначаць сваё стагоддзе. Тут жыве вялікая колькасць насельніцтва, засяроджана шмат прадпрыемстваў, працуе высокатэхналагічная пляцоўка СЭЗ «Магілёў». Раён дынамічна развіваецца, будуецца, прыгажэе. З якімі дасягненнямі і настроем набліжаецца ён да сваёй салідная юбілейнай даты? Чым ганарыцца? З гэтымі пытаннямі мы звярнуліся да старшыні Магілёўскага райвыканкама Алега ЧЫКІДЫ.**



— 100 гадоў — гэта добры старт у другое стагоддзе, — адзначае Алег Іванавіч. — Ідзём наперад з упэўненасцю, ставім перад сабой амбіцыйныя задачы. Вельмі ўдзячныя кіраўніку дзяржавы Аляксандру Лукашэнку і нашаму губернатару Анатолю Ісачанку за тое, што дапамагаюць. З такімі кіраўнікамі можна горы звярнуць. Гэта прадбачлівыя, мудрыя кіраўнікі.

Магілёўскі раён вельмі значны не толькі для вобласці, але і ў цэлым для Беларусі. У нас шмат чаго робіцца для паляпшэння якасці жыцця людзей. Мы з удзячнасцю ўспамінаем тых, хто працаваў на карысць раёна ў ранейшыя гады; супрацоўнічаем з тымі, хто жыве за межамі раёна, але не забываецца пра яго, імкнецца зрабіць свой пасільны ўнёсак.

Мы з пачуццём гонару і адказнасці святкуем сваё 100-годдзе і 80-годдзе вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Асноўная задача, як кажа Прэзідэнт, — дабрабыт народа. А гэта стварэнне рабочых месцаў, годная заработная плата, выкананне сацыяльных стандартаў. Гэта якасныя медыцына і адукацыя, навядзенне парадку на дарогах. Сёлета ўводзім у эксплуатацыю больш як 50 пабудаваных ці капітальна адрамантаваных аб'ектаў. Сярод іх дзіцячы садок на 95 месцаў, сем устаноў адукацыі, шэсць малочнатаварных комплексаў. Займаемся рэканструкцыяй аўтадарогі Магілёў — Чэрыкаў — Касцюковічы, праектны кошт якой складае каля 30 мільёнаў рублёў, будуем участак дарогі Раманавічы — Гарбавічы. На асаблівым уліку — жыллёвае пытанне. Сёлета мы запланавалі пабудаваць два шматкватэрныя дамы (4751 квадратны метр жылля), у тым ліку дзевяць арэндных кватэр, шэсць — сацыяльнага карыстання, дзесяць — для работнікаў сельскагаспадарчай галіны. У аграгарадку Палыкавічы працягваецца рэалізацыя праекта шматкватэрнай жылой забудовы «Красавік» са стварэннем інжынерна-транспартнай інфраструктуры, распрацоўваецца праект дэталёвай планіроўкі квартала шматкватэрнай жылой забудовы «Лясны». Вялікая ўвага аддаецца добраўпарадкаванню населеных пунктаў: абнаўляюцца новыя дзіцячыя пляцоўкі, рамантуюцца прыдамавыя тэрыторыі, уцягваюцца ў гаспадарчы абарот старыя і пустыя дамы.

***— Сёлета Магілёўскі раён ставіў новыя рэкорды ў адукацыі і спорце. Школы раёна падрыхтавалі вялікую колькасць медалістаў. Добрыя вынікі дэманструюць і мясцовыя хакеісты.***

— Дасягненні нашых выпускнікоў сапраўды высокія. Са 124 выпускнікоў 24 медалісты — сапраўды рэкорд у Год якасці. Акрамя гэтага, пасведчанні аб базавай адукацыі «З адзнакай» атрымалі 11 выпускнікоў базавых школ. Гэта не проста выпадковасць, а вынік сумеснай карпатлівай працы саміх вучняў, іх бацькоў і педагогаў.

Нельга не ганарыцца поспехамі нашых хакеістаў з Кадзінскай сярэдняй школы — «Кадзінскія львы». Яны нязменна дэманструюць высокія вынікі, нягледзячы на адсутнасць лядовай арэны. На працягу многіх гадоў каманду ўзначальвае яе заснавальнік — настаўнік фізічнай культуры Леанід Камароў. Ён прыцягвае новую моладзь, захапляе яе гэтым відам спорту. У рэспубліканскіх спаборніцтвах сярод дзяцей і падлеткаў па хакеі «Залатая шайба» на прызы Прэзідэнта Беларусі нашы «львы» ў дзясяты раз — у тройцы прызёраў.

У раёне працуюць таленавітыя творчыя калектывы. Летась пяць з іх пацвердзілі званні «Народны» і «Узорны».

Сёлета ў новым фармаце прайшоў раённы фестываль сямейнага адпачынку і здаровага ладу жыцця «Гарбата па-сваякоўску». На свята прыехалі прадстаўнікі Смаленска, Ханты-Мансійскай аўтаномнай акругі — Югры, краін Афрыканскага кантынента, Турцыі, Узбекістана і Кітая. Сімвал нашага фестывалю — дом, дзе цёпла, чыста і ўтульна, дзе чуецца дзіцячы смех, дзе заўсёды з задавальненнем, душэўнасцю і гасціннасцю сустракаюць гасцей.

***— Наколькі плённа працуюць прамысловасць раёна, прыватны бізнес? Як складваецца абстаноўка з інвестыцыямі, новымі рабочымі месцамі, заработнай платай?***

— Раён працуе з прыбыткам. За чатыры месяцы створана 41 новая арганізацыя. Прадпрыемствы малога бізнесу Магілёўскага раёна актыўна інвесціруюць ва ўласнае развіццё. Як вынік — трэці год запар раён становіцца найлепшым па развіцці прадпрымальніцтва ў вобласці. У Магілёўскім раёне шэраг прадпрыемстваў рэалізуюць інвестпраекты. За апошнія пяць гадоў у эканоміку Магілёўскага раёна прыцягнуты два мільярды рублёў інвестыцый. За гэты ж перыяд за кошт стварэння новых прадпрыемстваў і вытворчасцяў працаўладкавана больш чым 1600 чалавек. Летась у раёне ў рамках даручэння Прэзідэнта «Адзін раён — адзін праект» рэзідэнтам СЭЗ «Магілёў» — ЗТАА «Омск Карбон Магілёў» рэалізаваны інвестпраект па будаўніцтве завода па вытворчасці тэхнічнага вугляроду. Засвоена звыш 320 мільёнаў рублёў інвестыцый у асноўны капітал, створана каля 570 новых рабочых месцаў, што на 150 больш, чым прадугледжваў інвестдагавор. У праграму «Адзін раён — адзін праект» уключылася прадпрыемства ТАА «Баір Вест», якое наладжвае выпуск уласных кампанентаў для прамысловых кандыцыянераў. Раней выкарыстоўваліся імпартныя дэталі.

Найбольшы ўклад у агульны аб'ём прамысловай вытворчасці раёна ўносяць ЗТАА «Кронаспан ОСБ», ЗТАА «Омск Карбон Магілёў», ТАА «Новус Індустры». Стабільная работа прадпрыемстваў забяспечвае пастаянны рост заработнай платы, павелічэнне падатковых выплат у бюджэт. Магілёўскі раён сёння займае лідзіруючыя пазіцыі па сярэднямесячнай зарплаце з усіх сельскагаспадарчых раёнаў вобласці. 47 % бюджэтных сродкаў накіроўваецца на развіццё сацыяльнай сферы.

Арганізацыі Магілёўскага раёна працагваюць гандляваць з 40 краінамі свету. За межамі Беларусі запатрабаваны мяса птушкі, пліты ДСП, аміна-альдэгідныя смолы, тэхнічны вуглярод, металаканструкцыі, мэбля і іншая прадукцыя дрэваапрацоўкі, прадметы асабістай гігіены. Асноўным знешнеэканамічным партнёрам з'яўляецца Расійская Федэрацыя. Летась удвая быў павялічаны экспарт прадукцыі ў Азербайджан, на 43 % — ва Узбекістан, на 40 % — у Кыргызстан. Істотна вырас экспарт у Кітайскую Народную Рэспубліку, у Чэхію, Славакію, Славенію. На пятым раённым інвестфоруме «Магілёўскі раён — тэрыторыя магчымасцяў» падпісаны 31 афіцыйны дакумент аб прыцягненні інвестыцый, пастаўках прадукцыі на экспарт, пагадненні аб супрацоўніцтве. У апошнія гады Магілёўскі раён па аб'ёмах інвестыцый, экспарту тавараў, будаўніча-мантажных работ, уводу ў эксплуатацыю жылля апярэджвае не толькі ўсе раёны Магілёўскай вобласці.

Задачы, якія ставіць перад сабой у Год якасці Магілёўскі раён, — гэта стварэнне беражлівых адносін да рэсурсаў і адказнасць за вынікі сваёй працы. Захоўваючы курс на сацыяльную стабільнасць, рост дабрабыту і якасць жыцця людзей, мы вырашаем задачы рознай складанасці. Наша сіла ёсць і застаецца ў працавітасці, адзінстве і шчырай любові да роднай зямлі.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота з сайта Магілёўскага райвыканкама.**

Жніво-2024

# «БЕРАГЧЫ І АДНАЎЛЯЦЬ»

## Як Валожын рыхтуецца да «Дажынак»

**На Міншчыне права прымаць абласны фестываль-кірмаш працаўнікоў вёскі «Дажынкі-2024» сёлета атрымаў горад Валожын. Увосень сюды з усяго рэгіёна з'едуцца героі хлебнай нівы, каб прымаць заслужаныя ўзнагароды і віншаванні. Як райцэнтр рыхтуецца да такой важнай падзеі, якія аб'екты чакае маштабная мадэрнізацыя, а што патрабуе толькі невялікага рамонту — абмеркавалі на пасяджэнні штаба па падрыхтоўцы да абласных «Дажынак» з удзелам старшыні Мінскага абласнога выканаўчага камітэта Аляксандра ТУРЧЫНА.**

У горадзе ўжо актыўна праходзяць добраўпарадкаванне вуліц, капітальны і бягучы рамонт жылога сектара, аднаўленне фасадаў грамадскіх устаноў: бібліятэкі, раённага цэнтра культуры, Дома быту. Таксама ўводзіцца ў эксплуатацыю сучасная сістэма асвятлення вуліц — святлодыёдныя ліхтары. Асфальтуюцца тратуары, а валожынскія шматпавярховікі набываюць непаўторны выгляд дзякуючы муралам.

«Сёння хацелася б завастрыць увагу на гэтай лакацыі, — распавёў старшыня Мінскага абласнога выканаўчага камітэта Аляксандр Турчын. — Мы ўжо гаварылі аб нашых падыходах у сістэме жыллёва-камунальнай гаспадаркі і гэтак далей. Усё ідзе сваім парадкам. Вырашаем застарэлыя праблемы Валожына: гарачая вада, каналізацыя, вулічна-дарожная сетка».

многія людзі па ўсім свеце, абяцаючы даць унікальныя экспанаты для адкрыцця тут музея. Таму з'яўленне такой славутасці стане дадатковым стымулам для наведвання Валожына. З улікам таго, што праз Беларусь праходзіла велізарная колькасць, прычым не нашых, войнаў, многія аб'екты проста сцёртыя з твару зямлі. І тое, што ў нас засталося, мы павінны берагчы і аднаўляць, каб маглі не толькі мы, але і нашы нашчадкі яшчэ заходзіць у такія выдатныя аб'екты і пазнаваць гісторыю нашай цудоўнай Радзімы», — дадаў кіраўнік Міншчыны.

Гарадская цэнтральная плошча — асноўнае месца правядзення свята. Надаць ёй сучасны выгляд вырашана за кошт абнаўлення фасадаў будынкаў, дарожных знакаў, малых архітэктурных формаў. Да 1 жніўня



На думку губернатара, тут, на Валожыншчыне, найцікавейшыя месцы. «Архітэктура, якая, на шчасце, захавалася, прадстаўлена выдатнымі будынкамі, палацава-паркавым ансамблем, касцёлам, іешывай. Лічу, што ў перспектыве Валожын павінен стаць месцам прыцягнення для турыстаў. Таму тут важная кожная дробязь. І невыпадкова, праходзячы сёння пешшу вакол цэнтральнай плошчы горада, бачыш на фоне маштабных змяненняў розныя дробязі, якія трэба ліквідаваць і паправіць», — акцэнтаваў ён.

Яшчэ адзін пункт — мясцовыя могілкі. 750 метраў новай агароджы павінна з'явіцца да 20 ліпеня. Работы працягваюцца. «Просьба сур'ёзна ставіцца да ўсіх агучаных слоў і тэрмінаў. Усюды павінен быць парадак», — сказаў губернатар.

Ён адзначыў асаблівую важнасць аднаўлення гістарычных сімвалаў і ўнікальнасць будынка іешывы (першага вышэйшага духоўнага вучылішча іўдзеяў на тэрыторыі Усходняй Еўропы).

«Да гэтага ўнікальнага збудавання ўжо праяўляюць цікавасць

тут плануюць абнавіць плітку. На гэтым тыдні на цэнтральнай плошчы горада павінны замяніць электракабель.

Істотна абноўлены і жылфонд. Цудоўныя муралы ўпрыгожылі многія дамы. Капрамонт зведаюць дванаццаць дамоў, з іх восем ужо ўведзена ў эксплуатацыю. Бягучы рамонт выкананы ў васьмі з 24 дамоў.

Прывесці ў парадак збіраюцца і раку Валожынку. Месцамі яна зарасла і выглядае недагледжанай. Дадатковыя сродкі на рамонт дарог у Валожыне гатовы выдзеліць Мінскі аблвыканкам. А ў лістападзе—снежні гэтага года ў мясцовай бальніцы з'явіцца кабінет КТ. Будзе адрамантавана і прыёмнае памяшканне.

«У нас няма завяршанасці ў работах. Мы робім асноўнае, а на дробязі не звяртаем увагі. І гэта самае непрыемнае, — адзначыў кіраўнік цэнтральнага рэгіёна. — Хачу сказаць усім кіраўнікам: звярніце ўвагу на свае аб'екты. Усюды павінен быць парадак да 1 жніўня».

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ, фота аўтара.**

На адной хвалі

# На тэлеэкране — «Славянскі базар 2024»




**Ужо праз некалькі дзён, з 9 да 14 ліпеня, гасцей і ўдзельнікаў ізноў будзе прымаць XXXIII Міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску».Назіраць за найбольш яркімі падзеямі летняга культурнага форуму традыцыйна ўсе ахвотныя змогуць і ў тэлеэфіры.**

Так, падчас фестывалю на тэлеканале «Беларусь 1» нас будуць чакаць «Дзённікі фестывалю» пасля праграмы «Панарама». Сачыць за падзеямі свята зможам і ў выпусках культурных навін. Не застанемся мы і без трансляцый знакавых канцэртных праграм. Урачыстае адкрыццё на «першай кнопцы» сваёй аўдыторыі прадставяць у вячэрнім эфіры (у 22.00) у чацвер, 11 ліпеня. А ў пятніцу, 12 ліпеня, у гэты ж час там пакажуць гала-канцэрт «Саюзная дзяржава запрашае...». Урачыстае закрыццё фестывалю на тэлеэкранах нас чакае ў нядзелю 14 ліпеня ў 21.00. Гэты канцэрт будзе ўключаць у сябе выступленні другога конкурснага дня ўдзельнікаў XXXIII Міжнароднага конкурсу выканаўцаў эстраднай песні «Віцебск-2024», дзе ў іх выкананні мы пачуем сусветныя хіты.

На тэлеканале «Беларусь 3» запланаваны для тэлеаўдыторыі трансляцыі XXII Міжнароднага дзіцячага музычнага конкурсу «Віцебск» 10 і 11 ліпеня ў 14.00. І ў такі ж час 12 ліпеня цырымонія ўзнагароджання пераможцаў Міжнароднага дзіцячага музычнага конкурсу і гала-канцэрт з удзелам міжнароднага журы. А вось конкурсное спаборніцтва ўдзельнікаў XXXIII Міжнароднага конкурсу выканаўцаў эстраднай песні «Віцебск-2024», дзе прадстаўнікі з розных краін выступяць са «Славянскім хітом», зможаце паглядзець у суботу, 13 ліпеня, на тэлеканале «Беларусь 1». Сачыце за тэлепраграмай і плануйце прагляды тых мерапрыемстваў, дзе з задавальненнем будзеце бавіць час пад гукі любімых мелодый.

**Алена ДРАПКО.**

## ШАШКІ («Звязда»)

Выпуск № 221

**З 15 да 17 чэрвеня ў Гродне прайшла Рэспубліканская спартакіяда школьнікаў. Перамагла каманда Віцебскай вобласці (Дар'я Нарчук, Іван Невар, Арцём Гутан, Анастасія Бутаровіч). На другім месцы — Мінск, на трэцім — Магілёўская вобласць.**

8 чэрвеня 85-гадовы юбілей адзначыў Барыс Міхайлавіч Плоткін — майстар спорту, сярэбраны прызёр чэмпіянату Беларусі 1960 года па стоклетачных шашках.

№ 100



№ 100 В. Варушыла (Мінск)

**Белыя простыя:** e1, b2, e3, g3, d4, f4, e5, g5 (8)

**Чорныя простыя:** h2, c3, a5, h6, c7, e7, g7 (7)

№ 101 Ю. Мурадаў (Барысаў)

**Белыя простыя:** e1, g1, d2, f2, h4 (5)

**Чорныя простыя:** h2, b4, d4, g5, b6, f6, e7, g7, h8 (9)

№ 102 Я. Кандрачэнка (Гомель)

**Белыя простыя:** a1, b2, f2, c3, e3, e5, b6 (7)

**Чорныя простыя:** a5, g5, h6, a7, c7, g7, d8, f8 (8)

№ 103 В. Арцюхін (Мінск)

**Белыя простыя:** d2, g3, f4, g5 (4)

**Чорныя простыя:** h2, e3, b4, c7, e7, g7 (6)

Астатнія кампазіцыі па правілах бразільскіх шашак склаў Г. Андрэеў.

№ 104

**Белыя простыя:** b2, f2, h2, c3, f6 (5)

**Чорныя простыя:** d4, f4, h4, e5 (4)

№ 105

**Белыя простыя шашкі:** a1, d2, c3, d4, c5, a7 (6)

**Чорныя простыя шашкі:** a3, g3, f4, h4, f6, e7 (6)

№ 106

**Белыя простыя шашкі:** c1, g1, c3, d4, c5, b6, g7 (7)

**Чорныя простыя шашкі:** f2, e3, g3, h6, e7, b8 (6)

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць. Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

Анонс. З 15 да 19 ліпеня ў аг. Жыровічы (Слонімскі раён) адбудзецца XIV Рэспубліканскі турнір па шашках-100, прысвечаны Дню вызвалення Слоніма.

Праверце свае рашэнні:

Выпуск № 220 ад 21.06.24.

№ 93 1. b4-c5 d6:d2 2. d4-b6 a7:c5 3. e5-d6 c7:e5 4. f4:c1 h2:f4 5. c1:b4 a5:c3 6. f2-g3 h4:f2 7. g1:e3+

№ 94 1. c3-d4 e5:c3 2. e3-f4 g3:e5 3. c5-d6 e7:c5 4. a3:g3 h2:f4

[ 4...h4:f2 5. g5:e7 f8:d6 6. e1:g3 h2:f4 7. h6:g5 ]

5. g5:e7 f8:d6 6. h6:h6 h4-g3 7. h6-e3 g3-h2 8. e3-g1 c7-b6 9. g1:a7 h2-g1 10. e1-f2+

№ 95 1. a3-b4 c3:a5 2. c5-a3 e7:c5 3. a3:b4 a5:c3 4. g5:e7 f8:d6 5. h6:f4 b8-a7 6. f4-c7+

№ 96 1. c5-b6 e7:a7 2. g5:e7 f8:d6 3. h6:g1 a7-b8 4. g1-h2+

№ 97 1. 22-17 12:32 2. 23:03 34:45 3. 03:20 15:22 4. 44-40 45:34 5. 43-39 34:43 6. 49:09 10-14 7. 09:20 25:14 8. 48-43+

№ 98 1. 29-23 12:32 2. 26:45 18:29 3. 45:05 32:23 4. 05:49+

№ 99 1. 18-13 09:29 [ 1...24:21 2. 38:47 21:49 3. 47-33 40-45 4. 33-50 ]

2. 28-23 29:18 3. 38-42 24:47 4. 43-38 47:11 5. 06:22 40-45 6. 22-50+

Першымі дакладныя адказы даслалі: В. Арцюхін, Э. Дамброўскі, П. і В. Шульгі (усе — Мінск), С. Рашэцін (Ашмяны), В. Таўкачоў (в. Уздзевічы Клімавіцкага р-на Магілёўскай вобл.), Ф. Карпей, Л. Жыхар (абодва — Мядзель), У. Панько (Камянец), І. Ананіч (Гродна).

**Пішыце па адрасе: газета «Звязда», г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, e-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru**

**Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.**

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

Сядзі і глядзі

## ВЫБАР ВЫЗНАЧАЕ ЖЫЦЦЁ

**Прыхільнікаў беларускага кінематографа зноў парадуюць сваімі прапановамі тэлеканалы, дзе працягваюць дэманстраваць мастацкія кінастужкі «Беларусьфільма» розных гадоў. І ў найбліжэйшыя выхадныя там кожнаму знойдзецца што паглядзець.**

